**Лейзер Н.А.,**
**выкладчык**

# СУЧАСНЫЯ НАКІРУНКІ РАЗВІЦЦЯ КАМУНЫКАТЫЎНЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ СТУДЭНТАЎ У ПРАЦЭСЕ ВЫВУЧЭННЯ ЗАМЕЖНЫХ МОЎ

У наш час у цэнтр працэсу навучання ставіцца асоба навучэнца. Фокус перамяшчаецца з навучання асобным словам і моўным структурам, метадам іх выкладання і праверкі на саміх вучняў. Для якіх мэт ім можа спатрэбіцца замежная мова? У якіх сітуацыях яны будуць яе выкарыстоўваць? Як ім трэба паводзіць сябе, каб супрацоўнічаць з жыхарамі іншых еўрапейскіх краін? Гэты пытанні патрабуюць сур'ёзных адказаў.

Карэнны паварот ад пытання "што?" да пытання "як?" выкладаць прадугледжвае зрух ад аб'ектыўных, структурных перспектыў да суб'ектыўных, функцыянальных.

Навучанне -- гэта працэс, які цягнецца ўсе жыццё. Навучанне мове нельга разглядаць як чыста тэхнічны працэс, не звязаны з сацыяльнымі, культурнымі, палітычнымі аспектамі адукацыі. Пастаянна ўзнікаюць праблемы ўзаемаадносін чалавека і грамадства, прыроды лідэрства, адносін паміж выкладчыкам і навучэнцам. Асноўная задача выкладчыка - забяспечыць развіццё незалежнай, аўтаномнай, свабоднай, сацыяльна адказнай асобы, якая добра ведае і ганарыцца культурнай спадчынай свайго народа і, адначасова, падрыхтавана да прыняцця культурных каштоўнасцей іншых нацый.

Абапіраючыся на гэтае філасофскае палажэнне, зносіны можна разглядаць як недзялімы, неабходны аспект працэсу грамадскага супрацоўніцтва. Класны пакой пераўтвараецца ў майстэрню, дзе навучэнцы паступова развіваюць у сабе магчымасці, неабходныя для эфектыўнай камунікацыі ў адпаведных умовах. Гэта і будзе падрыхтоўкай да жыцця ў грамадстве, якое зараз перажывае «камунікацыйны выбух».

Такім чынам, асноўнымі прынцыпамі ў навучанні камунікацыі на замежнай мове з'яўляюцца наступныя:

- адносіны да навучання як да паступовага, мэтанакіраванага развіцця ў студэнта аўтаноміі, адказнасці і індывідуальнасці;
- выпрацоўка дакладных мэт, атрыманых шляхам пільнай ацэнкі патрэбнасцей, матывацый, магчымасцей навучэнцаў;
- патрэбнасць абмяркоўваць і прыходзіць да пагаднення паміж зацікаўленымі бакамі.

Для ажыццяўлення гэтых прынцыпаў неабходна выкарыстоўваць вызначаныя метады. Але метады, якія даюць добрыя вынікі ў адной групе навучэнцаў, могуць «не працаваць» у іншай групе. Адзін выкладчык дабіваецца поспехаў, выкарыстоўваючы метад «высокай актыўнасці» (High activity method), другі разглядае яго як прымушальны і ненатуральны. Тым не менш прафесіяналізм выкладчыка, які авалодаў рознымі метадамі, безумоўна, расце.

Камунікатыўны падыход у асноўным сканцэнтраваны на навучэнцы; яго мэта -- развіць жаданне студэнтаў вывучаць замежную мову, замацаваць і пашырыць іх веды і вопыт. Гэта дасягаецца выбіраннем тэм, тэкстаў, відаў заданняў, якія адпавядаюць мэтам вучэбнага плана. Камунікатыўныя магчымасці студэнтаў развіваюцца таксама, калі іх уключаюць у кола значных, рэальных, дасягальных задач, паспяховае вырашэнне якіх дае задавальненне і павялічвае ўпэўненасць студэнтаў у сваіх сілах.

Сярод асноўных накірункаў камунікатыўнай дзейнасці трэба падкрэсліць наступныя:

- уменне весці справы (паездкі, планаванне, назначэнне дзелавых сустрэч і г.д.);
- уменне даць і атрымаць фактычную інфармацыю як асаблівага, так і звычайнага характару;
- устанаўленне і падтрыманне сацыяльных і прафесійных кантактаў (сустрэчы, знаёмствы, запрашэнні, абмен інфармацыяй, поглядамі).

Улічваючы спецыфіку нашай ВНУ, выкладчык замежнай мовы ўдзяляе асаблівую ўвагу тэмам, якія звязаны з краязнаўствам, традыцыямі і звычаямі, літаратурай, тэатрам,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музыкай, жывапісам, кінематографам краін вывучаемай мовы.

Устанаўленне міжпрадметных сувязей замежнай мовы як дысцыпліны з іншымі гуманітарнымі і спецыяльнымі дысцыплінамі, якія вывучаюць студэнты, дазваляе актывізаваць развіццё іх камунікатыўных здольнасцей.

**Рудніцкая Л.Р.,**
ст. выкладчык

## ПРАЕКТНАЯ МЕТОДЫКА НА ЗАНЯТКАХ ПА ЗАМЕЖНЫХ МОВАХ ЯК СРОДАК РАЗВІЦЦЯ ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ

У апошні час амаль ва ўсіх краінах свету назіраецца тэндэнцыя да гуманізацыі адукацыі, развіцця асобы навучэнца, тэндэнцыя, якая ажыццяўляецца пры індывідуальным падыходзе да студэнтаў.

Для ажыццяўлення індывідуальнага падыходу мы выкарыстоўваем праектную методыку. Яна дапамагае студэнтам выказваць свае думкі, пачуцці, актыўна ўключацца ў рэальную іншамоўную дзейнасць на занятках па замежных мовах у выглядзе праектаў, якія могуць быць амаль па кожнай тэме, адлюстроўваючы рэальнае альбо фантастычнае асяроддзе і, такім чынам, дапамагаючы развіваць увесь спектр здольнасцей студэнтаў.

Асноўнай характэрнай асаблівасцю праектнай методыкі з'яўляецца выкарыстанне ўсіх лепшых ідэй традыцыйнай, сучаснай і навейшай методык выкладання замежных моў, сярод якіх -- разнастайнасць форм вучэбнай дзейнасці (індывідуальная, парная, групавая); праблемны характар прапануемых заданняў; вывучэнне з задавальненнем; эгафактар, улік асабістых інтарэсаў і пажаданняў студэнтаў.

Праектная методыка можа выкарыстоўвацца на розных этапах навучання (пачатковым, сярэднім, прасунутым) для навучэнцаў рознага ўзроўню падрыхтоўкі па замежных мовах. Гэтая методыка адлюстроўвае галоўныя элементы камунікатыўнага падыходу да вывучэння замежных моў: адносіны студэнта да вывучаемай мовы, да агульных адукацыйных каштоўнасцей, спалучэнне праграмы па замежнай мове з прафесійна-адукацыйнымі задачамі студэнта. Праектная методыка ажыццяўляе двухбаковую сувязь, выкарыстоўвае мімвольнае запамінанне лексічных сродкаў і граматычных структур у ходзе рашэння праблемных задач, стымулюе развіццё творчага мыслення і ўяўлення.

Праектная методыка грунтуецца на выкананні праектных заданняў. Праца над імі прадугледжвае:

1. Планаванне занятка. Супрацоўніцтва выкладчыка са студэнтамі пры абмеркаванні зместу і аб'ёму праекта, сродкаў мовы, форм работы (інтэрв'ю, візіты) і вынікаў гэтай дзейнасці ў выглядзе памфлетаў, брашур, ілюстрацый.
2. Выкананне праектаў пасля заняткаў / правядзенне інтэрв'ю, збіранне візуальнай і іншай нагляднасці/. Неабходна дадаць, што тут студэнты выкарыстоўваюць уменні чытання, гутаркі, пісьма, слухання.
3. Агляд і праверка работы. Парады і каментарыі выкладчыка, аналіз групавой работы і самастойнай працы пры падборы матэрыялу.
4. Выніковая прэзентацыя. Выбар формы прэзентацыі згодна з вынікам працы над праектам -- схема, стэнд, часопіс і г.д..

Вопыт выкарыстання праектнай методыкі на занятках па замежных мовах у Беларускім універсітэце культуры сведчыць аб тым, што яна дазваляе ажыццяўляць індывідуальны падыход да навучэнцаў, мабілізаваць іх пошукавыя і творчыя здольнасці.

**Гаўрына Л.М.,**
дацэнт

## ЗАКАНАМЕРНАСЦІ ФАРМІРАВАННЯ НАВЫКАЎ ДЫРЫЖЫРАВАННЯ

Адной з важных задач педагогікі дырыжыравання з'яўляецца актыўнае выкарыстанне натуральных псіхафізічных закана-



РЭПОЗІТОРЫЙ БГУКІ